**Вера Рыч**

# У вянок Пісьменьніку

Нехта некалі вызначыў генія як чалавека, што надае форму й значэньне свайму веку. Для мяне жыцьцё — і сьмерць — Васіля Быкава заключае ў сабе многія парадоксы беларускай гісторыі апошніх 60 гадоў. Ён быў пісьменьнікам, творы якога савецкая ўлада апантана адзначала прэміямі, але які пры гэтым адчуваў няспынны ціск цэнзуры. Ён быў адзіным сусьветна вядомым беларускім пісьменьнікам свайго часу (хоць і ў перакладах людзей, якіх, можна меркаваць, адбіралі паводле палітычнай добранадзейнасьці, а не паводле літаратурнага таленту), і пры гэтым замежныя чытачы — у тым ліку й некаторыя замежныя крытыкі й дасьледчыкі — лічылі яго расейскім літаратарам.

Быкаўскія творы савецкага часу былі напісаныя на тэму ня толькі прымальную, але і вітаную літаратурным канонам таго часу — «вялікай айчыннай вайны». Ня ён адзін пісаў на гэтую тэму; у 1940—50-х гадох аўтары ўва ўсім Савецкім Саюзе бачылі ў вайне тэму, якая дазваляла ня толькі знайсьці чытача, але й была палітычна «правільнаю». На жаль, палітычная «правільнасьць» зачаста абарочвалася пэўнай просталінейнасьцю сюжэту: адважныя савецкія салдаты й партызаны, крыважэрныя гітлерцы, здраднікі-паліцаі выконвалі свае ролі з праўдзівасьцю марыянэтак. Быкаў унёс у тэму новыя падыходы — ягоныя героі былі асобамі ў поўным сэнсе гэтага слова, ён не баяўся пісаць пра іхныя ўнутраныя страхі, перажываньні, пра зьдзічэньне звычайнага салдата, пра памылкі й жахі сыстэмы, за якую прыходзілася рызыкаваць, а часта і ахвяраваць жыцьцём. Пры гэтым яму ўдалося надаць новую шырыню й глыбіню жанру ваеннага раману.

Пасьля, у другой палове 1980-х, калі розныя «нефармальныя» групы й рухі паўсталі на абарону беларускае культуры, ідэнтычнасьці й традыцый, Быкаў

пачаў адыгрываць новую грамадзкую ролю. У апошнія гады свайго жыцьця ён быў вымушаны шукаць часовага прытулішча за мяжой, аднак паміраць вярнуўся ў Беларусь — і гэта красамоўна гаварыла пра цяперашні стан краіны. Як і рытуалы, якімі суправаджалася ягонае пахаваньне — калі за вонкавымі пахваламі ўладаў хавалася імкненьне абмежаваць маштаб падзеі, і настойлівасьць, зь якой ягоная сям'я дабівалася, каб пісьменьніка пахавалі пад бел-чырвона-белым сьцягам, а не пад флягам рэжыму.

Але навошта я ўсё гэта пішу? Вы, мае беларускія сябры, ведаеце гэта лепш, чым я. Проста дадаю гэтыя думкі, запісаныя далёка ад Беларусі, у вянок вялікаму пісьменьніку, зь якім я мела шчасьце сустракацца ў апошнія гады ягонага жыцьця.